МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

**ЗАГАД**

**ПРИКАЗ**

07.06.2018 № 95
г. Мінск

г. Минск

Аб выніках XXVI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

На падставе пункта 18 Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52, і пратакола пасяджэння журы XXVI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ад 15.05.2018 № 1,
ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць пераможцаў XXVI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» (далей – конкурс):

1.1. у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:

1.1.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.І. Герцэна дзяржаўнай установы «Сетка публічных бібліятэк г. Гомеля»;

Гальшанскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Ашмянская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.1.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзіцячы аддзел Краснапольскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Ткачова дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Краснапольскага раёна» Магілёўскай вобласці;

Рэдкарожскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Бабруйскага раёна» Магілёўскай вобласці;

1.1.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

Дзяржаўную ўстанову культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы» Брэсцкай вобласці;

Баярскую сельскую бібліятэку – дом вольнага часу дзяржаўнай установы «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка» Мінскай вобласці;

1.2. у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

1.2.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Спецыяльную бібліятэку для інвалідаў па зроку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»;

Цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Чачота дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.2.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

Вішоўскую сельскую бібліятэку-філіял № 6 дзяржаўнай установы культуры «Бялыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка» Магілёўскай вобласці;

1.2.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

Цэнтральную раённую бібліятэку імя Б.В. Стральцова дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Быхаўскага раёна» Магілёўскай вобласці;

Сельскую бібліятэку-клуб № 17 в. Вязынка дзяржаўнай установы культуры «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча» Мінскай вобласці;

1.3. у намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:

1.3.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. Скарыны дзяржаўнай установы культуры «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

Жыліцкую сельскую бібліятэку-філіял дзяржаўнай установы культуры «Сетка бібліятэк Кіраўскага раёна» Магілёўскай вобласці;

1.3.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Дзяржаўную ўстанову культуры «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Жукоўшчынскую сельскую бібліятэку – цэнтр духоўна-мастацкай спадчыны дзяржаўнай установы культуры «Дзятлаўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.3.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

Рэчыцкую цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

1.4. у намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:

1.4.1. дыпломамі пераможцаў конкурсу першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Гарадскую бібліятэку сямейнага чытання дзяржаўнай установы культуры «Светлагорская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

Дзяржаўную установу культуры «Лоеўская цэнтральная раённая бібліятэка» Гомельскай вобласці;

1.4.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Круглянская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Магілёўскай вобласці;

Здзітаўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.4.3. дыпломамі пераможцаў конкурсу трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

Цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

Філіял Роская гарпасялковая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Ваўкавыская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці.

2. Прысудзіць заахвочвальныя грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь:

Філіялу Скідзельская гарадская бібліятэка сямейнага чытання дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр» Гродзенскай вобласці;

Бібліятэцы-філіялу № 19 імя Е. Лось дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»;

Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»;

Маларыцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

Дорскай сельскай бібліятэцы дзяржаўнай установы «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» Мінскай вобласці;

Дзяржаўнай установе культуры «Свіслацкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Язёрскай сельскай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Чэрыкаўскага раёна» Магілёўскай вобласці.

3. Аддзелу бухгалтарскага ўліку (Гурыновіч А.М.) забяспечыць выплату грашовых прэмій названым у пунктах 1 і 2 гэтага загада за кошт сродкаў, прадугледжаных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг. (падпраграма «Мастацтва і творчасць»).

4. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы – начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Задзяркоўскую Н.І.

Міністр Ю.П. Бондар